**А. М. Кушнярэвіч**

# НЯМЕЦКІЯ МАСТАКІ ГЕСКІЯ ПРЫ ДВАРЫ КНЯЗЁЎ РАДЗІВІЛАЎ

Станаўленне эстэтычнай канцэпцыі позняга барока ў беларускім мастацтве ў многім звязана з дзейнасцю бацькі і сына Гескіх. Старэйшы з іх, Францішак Ксаверый Дамінік (1700 ?, Саксонія – 4.12.1764) працаваў у разнастайных відах і жанрах мастацтва – станковым і манументальным жывапісе, графіцы, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Валодаў нямецкай, французскай, польскай мовамі. Больш за 35 гадоў быў прыдворным мастаком князёў Радзівілаў [1, с. 530]. У 1727 г. Міхаіл Казімір Радзівіл па мянушцы Рыбанька запрасіў яго на службу. Францішак прыбыў да Радзівілаў разам з цесцем – доктарам Андрэям Малерам, які быў прыдворным лекарам і на працягу 16 гадоў даглядаў Францішку Уршулю, жонку князя. За высокія заслугі перад Радзівіламі гэты доктар быў пахаваны ў сакавіку 1743 г. у фамільнай крыпце, што зроблена ў сутарэнні касцёла езуітаў у Нясвіжы.

Гескага і доктара Малера мог парэкамендаваць князю Радзівілу хтосьці з іншых магнатаў у час адной з замежных паездак. Рыбанька ж, як вядома, часта наведваў два нямецкія княствы – Саксонію і Баварыю. У час аднаго з такіх падарожжаў, у 1723 г., ён атрымаў ад германскага імператара месца ў імперскім рэйхстагу [7, с. 496]. Паездкі да саксонскага курфюрста, караля польскага і вялікага князя літоўскага Аўгуста II (у Саксоніі Фрыдрых Аўгуст I), як у цэлым раз’езды Міхаіла Казіміра Радзівіла, былі для яго звычайнай справай. Так, у 1727 г. з 19 ліпеня па 12 жніўня Рыбанька быў у Дрэздэне, дзе адбылася вялікая падзея – узнагароджанне князя ордэнам Белага Арла. Аднак у яго «Дыярушы» няма звестак аб сустрэчы з доктарам Малерам і мастаком Гескім. Найбольш верагоднай асобай, запрасіўшай Малера і Гескага ў Нясвіж, на думку вядомага беларускага мастацтвазнаўцы В. Д. Бажэнавай, можна лічыць Яна Яблонскага, дробнага шляхціча, які быў на службе ў княгіні Ганны Радзівіл, а пазней яе сыноў. Яшчэ раней, у 1721–1724 гг., ён суправаджаў у якасці казначэя маладога Міхаіла Казіміра ў замежным падарожжы ў Парыж, Франкфурт, Мангейм, Ляйпціг, Віттэнберг. У снежні 1727 г. Яблонскі знаходзіўся ў Мангейме (Баварыя). Відаць, тады закончыў справу па заключэнні кантрактаў з Малерам і Гескім у Саксоніі [5, с. 76–80].

З германскімі землямі былі звязаны мастацкія інтарэсы Гескага на працягу ўсяго яго творчага шляху ў якасці прыдворнага мастака Радзівілаў. Саксонскае мастацтва з’яўляецца асновай тэхнічных навыкаў К. Д. Гескага. Запрашэнне гэтага майстра да двара Радзівілаў падкрэслівае мастацкія густы і арыентацыі нясвіжскага мастацкага двара на саксонскі каралеўскі аўтарытэт. Яскравым сведчаннем развіцця гэтых традыцый з’яўляецца паўтарэнне К. Д. Гескім кампазіцыі «Тайнай вячэры» у нясвіжскім касцёле езуітаў прыдворнага мастака саксонскага і польскага каралеўскага двароў Аўгуста II і Аўгуста III Луі де Сільвестра, які быў французскім мастаком [4, с. 23–24].

Творчая біяграфія К. Д. Гескага дзеліцца на некалькі перыядаў.

У першы перыяд (1727–1740) працаваў у Бяла-Падляску ў замку княгіні Ганны Радзівіл з Сангушкаў сярод мастакоў, якія належалі яе двару. Першай вядомай працай, якая дазволіла Гескаму замацавацца сярод радзівілаўскіх мастакоў, стала ўпрыгожанне невялікага драўлянага палаца ў Славяцінску, што недалёка ад Бяла-Падляску. Акрамя гэтага, ён стварыў вялікую колькасць станковых твораў для розных рэзідэнцый княгіні. Ад гэтага часу захаваўся падпісаны мастаком партрэт Яна Мікалая Радзівіла (1733 г.) з серыі партрэтаў у лаўровым вянку [2, с. 48]. Астатнія працы вядомыя па інвентарных вопісах палацаў княгіні. Жанры гэтых твораў дастаткова разнастайныя – нацюрморты, пейзажы, партрэты. Ксаверый Дамінік займаў пры двары Ганны даволі ганаровае месца «пана мастака» сярод майстроў-іншаземцаў [3, с. 159].

Другі перыяд жыцця і працы К. Д. Гескага звязаны з Нясвіжам, дзе ён працаваў у Радзівілаў амаль 24 гады (1740–1764). Аднак пачатковы этап гэтага перыяду складваўся для яго не вельмі ўдала. Вядома, што ў 1740–1742 гг. мастак знаходзіўся ў крытычнай сітуацыі, паколькі не меў пастаянных замоў і адпаведнага статусу пры двары князя. У 1742 г. ён атрымаў месца суперіндэнта на фаянсавай мануфактуры князя ў Свержні. Пасля гэтага становішча Ксаверыя Дамініка Гескага пры княжацкім двары стабілізавалася. Гескі забяспечыў наладжаную работу Сверrouteжанскай мануфактуры і з 1744 г. пачаў атрымліваць замовы на манументальныя працы. Дадзены перыяд творчасці Гескага можна рэканструяваць паводле інвентарных вопісаў інтэр’ераў палацаў у Нясвіжы (Замак і Эрмітаж), Гародні, Алыцы, якія дэкарыраваў у гэты час мастак (інтэр’еры не захаваліся), і жывапісу Нясвіжскага касцёла Божага Цела, дзе найбольш значнай аўтэнтычнай працай мастака быў вялікі алтарны абраз «Тайная вячэра». Ім таксама быў выкананы сакральны жывапіс для базыльянскага кляштара ў Новым Свержні. З 1746 г. К. Д. Гескі пачаў адказваць за працу ўсіх мастакоў радзівілаўскага двара. У 1751 г. ён разам з астатнімі прыдворнымі мастакамі ўпрыгожваў палац Радзівілаў у Брэст-Літоўску (не захаваўся). З 1752 года рыхтаваў эскізы ўзораў для габеленаў, якія адначасова былі і станковымі палотнамі гістарычнага жанру. Паводле дакументаў 1753 г. зрабіў дэкарацыі Слуцкага тэатра, дакументаваў у 1753–1754 гг. (6 партрэтаў у 1753 г. і 9 карцін у 1754 г.). У 1756–1758 гг. выканаў жывапісна-дэкарацыйныя работы ў Нясвіжскім кляштары бенедыкцінак. У 1750-я гг. К. Д. Гескі падпісваў свае лісты для князя як «прэм’ер маляж». Гэта значыць, што ён атрымаў тытул прыдворнага мастака Радзівілаў. К. Д. Гескі з’яўляўся таксама галоўным настаўнікам мясцовых «хлопцаў», творчасць якіх ў далейшым склала аснову мясцовай рэгіянальнай школы жывапісу.

К. Д. Гескі з’яўляецца мастаком, чый арганізацыйны і мастацкі таленты вызначылі высокі ўзровень нясвіжскага манументальна-дэкаратыўнага мастацтва. На адметнасць стыля К. Д. Гескага паўплывалі рэгіянальныя традыцыі і вопыт працы ў квадратурным перспектыўным жывапісе, які атрымаў шырокае распаўсюджванне ў нямецка-саксонскім мастацтве, што ў сваю чаргу знаходзілася пад італьянскім уплывам. Ілюзіяністычна-перспек-

тыўны жывапіс мастака адрозніваецца ад панарамнага жывапісу пачынальніка ўкраінскага манументальна-дэкаратыўнага жывапісу Станіслава Строінскага і стылю Сымона Чаховіча ў польскім жывапісе, вытрыманым у рымскай традыцыі позняга барока [6, с. 26].

У станковым жывапісе Гескі валодаў майстэрствам імітаваць яго «халендэрскую» (галандскую) манеру на аснове выкарыстання галоўных мастацкіх прыёмаў ранейшых творцаў Рэмбранта, Хальса, Рубенса [6, с. 18]. Затым у імітацыйнай манеры пачалі працаваць усе майстры нясвіжскага мастацкага двара (Мікалай Струмецкі, Канстанцін Пятрановіч, Юзаф Ксаверый Гескі–малодшы, Казімір Лютніцкі, Андрэй Зашконт, Міхаіл Скшыцкі, Станіслаў Мікалаеўскі). Творы мастацтва, выкананыя нясвіжскімі майстрамі, з'яўляюцца інтэрпрэтацыйнымі варыянтамі барочнага, ракайльнага, класіцыстычнага формаўтварэння і сведчаць аб адаптацыі іх да еўрапейскай стылістыкі. У сувязі з гэтым жывапіс Беларусі паўстае ў іншым творчым накірунку, напамінае мастацтва Саксоніі таго часу больш, чым Францыі і Італіі. Імітацыйная манера звязала творы мастакоў Нясвіжа са стылістыкай позняга барока [6, с. 16].

Другое пакаленне Гескіх пры двары князёў Радзівілаў прадстаўляе малодшы сын мастака Юзаф Ксаверый (1736?–1810?). Яго біяграфія вядома з дакумента 1794 г., напісанага мастаком на імя Кацярыны II з просьбай выплаціць яму грошы, якія недаплацілі за працу М. К. Радзівіл Рыбанька і яго сын К. С. Радзівіл Пане Каханку. У 1753–1781 гг. Юзаф з'яўляўся камісарам па сплаве лесу. Адначасова з брыгадай прыдворных мастакоў выконваў станковыя і манументальныя жывапісныя работы пад кіраўніцтвам бацькі, упрыгожваў інтэр'еры палацаў, замкаў і храмаў у радзівілаўскіх уладаннях. Дакументальна пацверджана яго размалёўка дамініканскага касцёла ў Нясвіжы (1763 г., не захаваўся). Яму таксама прыпісваецца размалёўка дамініканскага касцёла ў Стоўбцах (не захаваўся). У 1759 і 1782 г. удзельнічаў у манументальна-дэкаратыўных работах у Нясвіжскім кляштары бенедыкцінак. У 1783 г. рыхтаваў залы замка да прыёму караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Юзафу Ксаверыю прыпісваюць стварэнне партрэта караля, які цяпер захоўваецца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі [1, с. 531]. У пажары 1793 г. згарэў дом мастака, таму апошнія гады жыцця ён правёў у нясвіжскім дамініканскім кляштары, у якім стаў манахам [5, с. 80].

Такім чынам, творчасць нямецкіх мастакоў Гескіх з'уляецца важнай крыніцай для разумення вобразнай і стылістычнай арыентацыі беларускага мастацтва XVIII ст. Заснаванае К. Д. Гескім у беларускім мастацтве рэгіянальнае адганаліванне еўрапейскага перспектыўнага манументальнага жывапісу варта назваць «нясвіжскім барочным ілюзіянізмам».

## ЛІТАРАТУРА

1. *Бажэнава, В.* Гескія / В. Бажэнава // Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.] – Мінск : БелЭн, 2005. – Т. 1: Абаленскі-Кадэнцыя. – С. 530–531.

2. *Баженова, О.* Фамильный альбом портретов князей Радзивилов из Национального исторического архива Беларуси / О. Баженова // Мірскі замак: канцэпцыя рэстаўрацыі і праблемы музеефікацыі. – Мір, 2007. – С. 40–55.
3. *Баженова, О. Д.* Геский – придворный художник князя Михаила Казимира Радзивила Рыбоньки / О. Д. Баженова // Музей XXI ст.: актуальныя праблемы дзейнасці: матэрыялы навук.-практ. канф. – Мінск: Белпрынт, 2008 – С. 159–169.
4. *Бажэнава, В.* Радзівілы, мастак Ксаверый Дамінік Гескі й Саксонія / В. Бажэнава // Спадчына, 2003 (153). – № 4–5. – С. 23–25.
5. *Баженова, О.* Радзивиловский Несвиж: росписи костела Божьего Тела / О. Баженова. – Минск: Харвест, 2010. – 414 с.
6. *Баженова, О. Д.* Монументально-декоративное искусство Несвижа XVIII века: европейский контекст и стилистическое своеобразие: …автореф. дис. д-ра искусствоведения : 17.00.09. / О. Д. Баженова. – Минск, 2013. – 49 с.
7. *Грыцкевіч, А.* Радзівіл Міхаіл Казімір (мянушка Рыбанька) / А. Грыцкевіч // Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Т. 2 : Кадэцкі корпус – Яцкевіч. – Мінск : БелЭн, 2006. – 792 с.